*Дулаў А.М.*

# ДАСЛЕДАВАННІ КРЫНІЦ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, ПРАДСТАЎЛЕНЫЯ НА МІЖНАРОДНАЙ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ “АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КРЫНІЦАЗНАЎСТВА” (ВІЦЕБСК) У 2011–2019 гг.

З 2011 г. у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава раз на два гады праходзіць міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Актуальныя праблемы крыніцазнаўства” (першапачаткова – “Актуальныя праблемы крыніцазнаўства айчыннай гісторыі”). Арганізатарамі прадстаўнічага навуковага форуму, акрамя ВДУ імя П.М. Машэрава, выступаюць Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (Мінск), Навукова-педагагічная школа крыніцазнаўства – сайт Источниковедение.ru, Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці і Віцебскі абласны краязнаўчы музей. У 2011–2019 гг. у канферэнцыі прынялі ўдзел некалькі соцень навукоўцаў, якія прадстаўляюць навукова-даследчыя арганізацыі і вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, ЗША, Германіі, Польшчы і іншых краін. Традыцыйнымі тэмамі для абмеркавання сталі пытанні тэорыі і метаду крыніцазнаўства, крыніцазнаўства гістарыяграфіі, архівазнаўства і музейнага крыніцазнаўства, а таксама комплексы крыніц і асобныя крыніцы гісторыі розных эпох і рэгіёнаў. Зыходзячы з актуальнасці і значнасці гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у тэматычным полі канферэнцыі заўсёды прысутнічаюць даклады, прысвечаныя крыніцазнаўчаму і гістарыяграфічнаму аспектам праблемы. Мэта нашай працы – ахарактарызаваць тэматыку гэтых даследаванняў.

Гісторыкі і крыніцазнаўцы вывучаюць найперш пісьмовыя крыніцы гісторыі вайны. У зборніках канферэнцыі прадстаўлены даклады, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб пачатковым перыядзе Вялікай Айчыннай. Так, У.М. Крыўчыкаў зрабіў агляд дакументаў і матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, якія характарызуюць некаторыя аспекты матэрыяльнага забеспячэння Чырвонай Арміі напярэдадні і на пачатку вайны [3, с. 294–295]. Патэнцыял параўнальнага аналізу крыніц для стварэння карціны франтавых баявых дзеянняў на Віцебшчыне летам 1941 г. пераканаўча прадэманстраваў вядомы беларускі ваенны гісторык С.Я. Новікаў. На падставе параўнання звестак дакументаў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМА РФ) і Федэральнага ваеннага архіва Германіі аўтар рэканструяваў падзеі, звязаныя з ажыццяўленнем 5-м і 7-м механізаванымі карпусамі двух самастойных контрудараў у ходзе Лепельскай аперацыі 1941 г., што дазволіла паставіць пад сумніў папулярны ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі тэзіс пра тое, што ў раёне Сянно адбылася адна з буйнейшых танкавых бітваў

Рэпазіторый ВДУ

пачатку Вялікай Айчыннай вайны [2, с. 264–271]. Расійскі даследчык У.В. Фядзюнін паказаў інфармацыйны патэнцыял рассакрэчаных у 2000 г. дакументаў ЦАМА РФ як крыніцы пра стварэнне і дзейнасць заградатрадаў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. [1, с. 188–192].

Убачыць ваенную штодзённасць вачыма салдат вермахта, якія ваявалі на Усходнім фронце, дапамагае даследаванне іх лістоў, праведзенае ўкраінскім гісторыкам М.Р. Дубік. Даследчыца паказала, што эпісталярый акупантаў дазваляе прасачыць іх прыстасаванне да змяняючыхся падзей, рэакцыю на гэтыя падзеі, а таксама даволі хуткую трансфармацыю псіхалагічнага настрою і змену стаўлення да ворага ў бок паважлівага [1, с. 214–217].

Удзельнікі канферэнцыі прысвяцілі шэраг прац нямецкамоўным крыніцам акупацыйных органаў кіравання, характарызуючым эканамічную эксплуатацыю Беларусі. Крыніцазнаўчы патэнцыял арыгінальных матэрыялаў трафейнай Калекцыі дакументаў Генеральнага камісарыята “Беларусь” (ф. 370 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) для даследавання пытанняў выкарыстання працоўнай сілы акупантамі, а таксама працоўнай паўсядзённасці мясцовага насельніцтва прадэманстравалі С.Я. Новікаў [5, с. 308–312] і А.Г. Цымбал [5, с. 312–315]. І.Я. Куракова раскрыла інфармацыйную каштоўнасць дакументаў Дзяржархіва Гродзенскай вобласці як крыніцы даследавання фінансавай палітыкі гітлераўцаў у 1941–1944 гг. у акрузе “Беласток” [2, с. 275–278]. Агляд дакументаў архіва Аператыўнага штаба рэйхсляйтэра Розэнберга, што захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны, здзейсніла Ю.А. Геніна [5, с. 116–118].

Прыцягнулі ўвагу навукоўцаў і крыніцы па гісторыі акупацыйнай штодзённасці 1941–1944 гг. У гэтым кантэксце заслугоўваюць увагі працы аднаго з вядучых беларускіх спецыялістаў па гісторыі акупацыйнага перыяду Я.А. Грэбеня, у якіх у святле архіўных дакументаў раскрываюцца маладаследаваныя аспекты акупацыі. У прыватнасці, на падставе матэрыялаў фонда Віцебскай гарадской управы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВц) навуковец ахарактарызаваў прадпрымальніцкую дзейнасць як стратэгію выжывання грамадзянскага насельніцтва, што для шэрагу людзей стала крыніцай існавання і ўтрымання сям’і, ці, прынамсі, дадатковага заробку [3, с. 301–304]. Яшчэ адной стратэгіяй выжывання была падача позваў у міравы суд, які выступаў для людзей у якасці апошняй інстанцыі вырашэння спрэчных сітуацый. Аўтар акрэсліў інфармацыйны патэнцыял дакументаў Віцебскага міравога суда з ДАВц як крыніцы, што ілюструе глыбіню сацыяльных праблем акупаванага грамадства і мараль асобных грамадзян, якія імкнуліся выжыць любым коштам [2, с. 278–284]. Таксама Я.А. Грэбень на прыкладзе некаторых валасцей Петрыкаўскага раёна ў 1942 – першай палове 1943 гг. паказаў паўсядзённыя рэаліі жыцця сялян пад акупацыяй



Репозиторий ВГУ

на падставе дакументаў валаснох адміністрацыі з фондаў НАРБ [5, с. 315–318]. Гісторыкам вывучаліся дакументы калабарацыйных органаў як крыніца аб пенетэнцыярнай сістэме нацыстаў у акупаваным Віцебску [1, с. 196–202]. Канцэптуальны характар носіць ажыццёўлены Я.А. Грэбенем агляд апублікаваных і архіўных крыніц па праблеме становішча грамадзянскага насельніцтва ва ўмовах нацысцкай акупацыі [4, с. 279–283].

Даследчыца гісторыі жанчын Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны І.У. Нікалаева выступіла з дакладамі аб крыніцах жаночай акупацыйнай і пасляваеннай паўсядзённасці [1, с. 205–207; 4, с. 293–296]. Гісторык звярнулася таксама да крыніц гісторыі штодзённага жыцця насельніцтва ў постакупацыйны перыяд вайны (на прыкладзе Віцебшчыны), паказала каштоўнасць у гэтым кантэксце метаду вуснай гісторыі [3, с. 315–317; 5, с. 47–48].

Навукоўцамі вывучаўся патэнцыял крыніц асабістага паходжання ў даследаванні акупацыйнай штодзённасці. П.Д. Скурко прааналізавала ў дадзеным кантэксце дзённікі Браніслава Шпакоўскага (1921–1945), жыхара мястэчка Самахвалавічы Мінскага раёна. Дзённікі за 1940, 1941 і 1942 гг., знойдзеныя ў коміне ў тайніку ў 1970 г., захоўваюцца ў музеі ДУА “Самахвалавіцкая сярэдняя школа” [2, с. 271–275]. Паводле меркавання аўтара, нататкі Б. Шпакоўскага, якія ілюструюць паўсядзённае жыццё пад акупацыяй местачковай моладзі, “параўнальны з дзённікамі беларуса з Калінкавічаў Кастуся Ярмілава, а таксама Ганны Франк з Нідэрландаў, Тані Савічавай з Ленінграда – усё гэта непасрэдныя сведчанні «пасіўных» удзельнікаў вайны, не змененыя і не рэдагаваныя пазней” [2, с. 272].

Неапублікаваныя ўспаміны падпольшчыцы Ганны Кіташовай, напісаныя ў студзені – лютым 1967 г. па просьбе буйнейшай даследчыцы віцебскага падполля Н.І. Дарафеенка (1923–2015), як крыніцу акупацыйнай паўсядзённасці разгледзеў А.М. Дулаў. Ва ўспамінах знайшлі адлюстраванне стратэгіі выжывання, прыстасавання і супраціву гарадскога насельніцтва, вязняў турмы СД і канцлагера [3, с. 296–301].

Уяўляе цікавасць праца навуковага супрацоўніка Лепельскага раённага краязнаўчага музея Ю.С. Пухавіцкай, якая вызначыла асаблівасці пасляваенных (1966–1978 гг.) лістоў удзельнікаў лепельскага падполля з фондаў музея як гістарычнай крыніцы: магчымыя памылкі памяці; эмацыйнасць; выкарыстанне простамоўнай лексікі; “завуаліраванасць” пэўных фактаў; супярэчлівасць інфармацыі; наяўнасць звестак, якія не маюць дачынення да падзей вайны; суб’ектыўнасць у ацэнках асоб, нярэдка звязаная з асабістым стаўленнем да чалавека [2, с. 292–295].

Ролю вуснай гісторыі ў вывучэнні штодзённай і лакальнай гісторыі вайны прадэманстравалі ў сваіх працах вядомы гісторык А.Р. Агееў і краязнавец з Лепеля В.У. Тухта. Першы падзяліўся вопытам запісу інтэрв’ю людзей, якім падчас вайны было не меней за 7 гадоў, разам са студэнтамі



Репозиторий ВГУ

Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова падчас палявых даследаванняў на Магілёўшчыне 1996–2011 гг., што дазволіла ўбачыць асаблівасці індывідуальнага ўспрыняцця і памяці людзей пра акупантаў, калабарантаў і партызанаў, ваенныя падзеі, голад і інш. [1, с. 192–195]. В.У. Тухта праз досвед далучэння школьнікаў да запісу ўспамінаў паказаў ролю гэтых крыніц, побач з іншымі, ва ўдакладненні імёнаў землякоў-удзельнікаў савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг. і партызанскага руху падчас Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 195–196].

Значная ўвага надавалася даследаванню дакументаў Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) з фондаў НАРБ. Загадчык аддзела выкарыстання і публікацыі дакументаў Дзяржархіва Віцебскай вобласці У.П. Каханка ажыццявіў агляд матэрыялаў БШПР па гісторыі партызанскіх фарміраванняў, якія дзейнічалі на Віцебшчыне [1, с. 211–214]. Серыю прац аб крыніцах па разведвальнай і контрразведвальнай дзейнасці партызанаў прадставіў на навуковым форуме беларускі архівіст С.В. Кулінок [1, с. 208–210; 2, с. 285–287; 3, с. 304–306]. Звяртае на сябе ўвагу агляд даведачна-інфармацыйных дакументаў БШПР і партызанскіх злучэнняў пра дзейнасць германскіх разведвальна-дыверсійных школ і курсаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі [4, с. 283–285]. Інфармацыйны патэнцыял дакументаў, надрукаваных у зборніку “Зимнее волшебство”, як крыніц аб узаемадзеянні партызан Віцебскай і Калінінскай абласцей супраць нацысцкай карнай экспедыцыі ў лютым – сакавіку 1943 г. ахарактарызаваны А.А. Крываротам [4, с. 285–288].

Шэраг цікавых даследаванняў быў прысвечаны крыніцам, што захавалі звесткі пра жыццё розных сацыяльных груп насельніцтва ў савецкім тыле. Так, расійскі гісторык прафесар Р.Р. Хісамутдзінава грунтоўна ахарактарызавала інфармацыйны патэнцыял лістоў гадоў вайны як крыніцы вывучэння матэрыяльнага становішча калгаснікаў Урала [2, с. 288–292]. Украінскі навуковец В.В. Леўчанка звярнуў увагу на лісты У.І. Пічэты, які знаходзіўся ў эвакуацыі ў Ташкенце, украінскаму гісторыку С.І.-Я. Баравому ў Самарканд [5, с. 322–325]. Гісторык з Расіі І.І. Ханіпава прысвяціла сваё цікавае даследаванне крыніцам асабістага паходжання, якія паказваюць штодзённасць эвакуіраваных дзяцей у дзіцячых дамах Татарстана [3, с. 309–312]. А.А. Яфімава (РФ) раскрыла патэнцыял дакументальных крыніц з фондаў Цэнтральнага аб’яднанага архіва ўстаноў сістэмы адукацыі г. Масквы для даследавання працы Маскоўскага гарадскога дома піянераў у гады Вялікай Айчыннай вайны [3, с. 307–309].

Літаральна адзіная праца прысвечана крыніцам аб ходзе вызвалення Беларусі. Прафесар А.М. Катыёнаў з Новасібірска (РФ) ажыццявіў аналіз дакументальных крыніц, якія дазваляюць высвятліць страты ваеннаслужачых-сібіракоў у перыяд баёў за вызваленне тэрыторыі БССР у 1944 г. [5, с. 318–322].

Агляд адкрытых крыніц па гісторыі органаў дзяржаўнай бяспекі ў 1944–1954 гг. быў зроблены Г.Г. Краско [4, с. 291–293]. І.С. Ермацане (Рыга, Латвія) акрэсліла спецыфіку архіўна-следчых справаў НКУС

Репозиторий ВГУ

ваеннага часу як гістарычнай крыніцы. Даследчыца прааналізавала справы, галоўным чынам з фондаў Латвійскага дзяржаўнага архіва, салдатаў 201-й (43-й гвардзейскай) латышскай стралковай дывізіі Чырвонай Арміі, асуджаных за "здраду радзіме" і "антысавецкую дзейнасць", што дазволіла зрабіць высновы пра каштоўнасць інфармацыі крыніц як у ракурсе метадаў дзейнасці органаў НКУС, так і ў ракурсе стаўлення салдатаў-латышоў да савецкай улады, чалавечых лёсаў у экстрэмальных умовах вайны [3, с. 312–315].

Вывучаліся даследчыкамі дакументальныя крыніцы гісторыі ваеннага палону. Характарыстыку дакументаў беларускіх архіваў пра становішча савецкіх ваеннапалонных на акупаванай тэрыторыі рэспублікі дала ў сваёй працы А.М. Дакунова [1, с. 312–315]. Агляд матэрыялаў лагераў для ваеннапалонных вермахта і войскаў саюзных Германіі краін з Дзяржаўнага архіва Тамбоўскай вобласці прадставіў расійскі гісторык прафесар Ю.А. Мізіс [4, с. 288–291].

Да гэтых тэкстаў тэматычна набліжаецца праца польскага гісторыка доктара Д. Рогута, у якой ахарактарызаваны выбраныя польскія архіўныя фонды, што утрымліваюць успаміны інтэрніраваных у СССР вайскоўцаў Арміі Краёвай [1, с. 223–228].

А.А. Носава здзейсніла агляд дакументальных крыніц па тэме рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян у архівах Беларусі [1, с. 220–222].

Параўнальна няшмат дакладаў было прысвечана гістарыяграфічным крыніцам. С.Я. Новікаў у дакладзе з красамоўнай назвай "Новыя крыніцы, або савецкія стэрэатыпы?" ажыццявіў грунтоўны крытычны разбор кнігі "Великая Отечественная война 1941–1945 годов. В 12 т. Т. 2. Происхождение и начало войны" (М.: Кучково поле, 2012. – 1008 с.) [3, с. 77–80]. У іншым тэксце даследчык у параўнальным аспекце разгледзеў метадалагічныя падыходы савецкіх, сучасных беларускіх і нямецкіх даследчыкаў да вызначэння статусу месцаў масавага знішчэння людзей у раёне вёсак Малы і Вялікі Трасцянец, а таксама колькасці ахвяр нацысцкіх злачынстваў [4, с. 72–76]. С.Я. Новікаў прыйшоў да слушнай высновы пра неабходнасць стварэння беларускімі гісторыкамі "спецыяльнага навуковага даследавання па гэтай тэме з улікам дасягненняў навейшай тэорыі і метадалогіі, асабліва кампаратыўнага аналізу айчынных і замежных крыніц з мэтай атрымання новых навуковых ведаў" [4, с. 75]. Г.Г. Краско акрэсліў набыткі беларускай гістарыяграфіі па праблеме барацьбы органаў дзяржбяспекі з антысавецкім падполлем у 1944–1954 гг. [3, с. 81–83].

У некалькіх даследаваннях разгледжаны крыніцы гісторыі памяці аб вайне. М.В. Півавар вызначыў кола крыніц і даследаванняў для стварэння "Зводу помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны" [5, с. 362–365]. Доктар А. Фрыдман (Германія) ахарактарызаваў публікацыі газеты Камуністычнай партыі Люксембурга "Zeitung vum Lëtzebuerger Vollek" да 30-й гадавіны Перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне, у якіх расказвалася пра значэнне Перамогі, а таксама пра важкі



Репозиторий ВГУ

ўклад Савецкага Саюза ў перамогу над нацызмам, які, паводле выдання, імкнуліся прынізіць краіны Захаду [4, с. 316–319]. У крыніцазнаўчым даследаванні паштовак да вясновых святаў А.Я. Паўлава надала ўвагу паштоўкам да Дня Перамогі, якія даследчыца прапанавала падзяліць на дзве групы: сюжэтныя і сімвальныя [4, с. 308]. Малады лінгвіст Ю.У. Мянжынская прааналізавала назвы твораў мастакоў Віцебскага Паазер'я, тэматычна звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, і паказала, што не толькі самі творы мастацтва, але і іх назвы – артыонімы – могуць служыць крыніцай звестак пра гісторыю рэгіёна, актуалізаваць гістарычныя падзеі, іх час, знакавыя гістарычныя месцы, удзельнікаў гістарычных падзей [4, с. 314–316].

Невялічкі цыкл прац быў прысвечаны выяўленчым крыніцам – фотадакументам. Пачатак яму быў пакладзены ў 2013 г. канцэптуальнай працай загадчыка аддзела выкарыстання і публікацыі дакументаў Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці В.М. Матаха [2, с. 54–58]. Даследчык акцэнтаваў увагу на праблемах ідэнтыфікацыі фотаздымкаў часоў Другой сусветнай вайны, прывёў прыклады памылак, дапушчаных у анатацыях да фота ў беларускіх выданнях, намеціў шляхі павышэння эфектыўнасці архіўнай і археаграфічнай працы з фотадакументамі, а таксама іх выкарыстання ў навуковых даследаваннях. Грунтоўны аналіз гісторыі трафейных аэрафотаздымкаў Віцебска 1941 г. з Нацыянальнай адміністрацыі архіваў ЗША ажыццявілі амерыканскі даследчык доктар В. Гарадзецкі і намеснік дырэктара па навуковай рабоце Віцебскага абласнога краязнаўчага музея В.А. Шышанаў [4, с. 103–107]. Працягам тэмы стала праца малодшага навуковага супрацоўніка Музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Ю.У. Панкова, прысвечаная аэрафотаздымцы г. Гомеля 1941 г. з фондаў музея [5, с. 305–308]. Агляд фотаздымкаў Віцебска 1945 г. са збору Віцебскага краязнаўчага музея ажыццявіла галоўны захавальнік фондаў музея В.М. Давідоўская [3, с. 317–321].

Такім чынам, у зборніках віцебскіх крыніцазнаўчых канферэнцый апублікаваны шэраг матэрыялаў дакладаў, прысвечаных шырокаму колу дакументальных і апавядальных (мемуарных і эпісталярных) пісьмовых крыніц, перыядычнаму друку, а таксама фона- і фотадакументам, гістарыяграфічным крыніцам. Даследчыкі раскрылі інфармацыйны патэнцыял крыніц, якія дазваляюць рэканструяваць гісторыю ваенных дзеянняў, розныя аспекты акупацыйнага рэжыму і штодзённасці людзей пад акупацыяй, рух супраціву, жыццё ў савецкім тыле, дзейнасць органаў дзяржбяспекі ў гады вайны і ў першыя пасляваенныя гады, ваенны палон, інтэрніраванне вайскоўцаў Арміі Краёвай, рэпатрыяцыю савецкіх грамадзян, стан вызваленага Віцебска, памяць аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны. Звяртае на сябе ўвагу акцэнт на крыніцах, якія ствараюць аснову для вывучэння падзей вайны ў "чалавечым вымярэнні" ў кантэксце сучасных метадалагічных падыходаў і накірункаў гістарычных даследаванняў.

Репозиторий ВГУ

1. Актуальныя праблемы крыніцазнаўства айчыннай гісторыі : матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 6–7 кастрычніка 2011 г. / рэдкал.: А.М. Дулаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2011. – 350 с.
2. Актуальные проблемы источниковедения : материалы международной научно-практической конференции к 135-летию со дня рождения В.И. Пичеты, Минск–Витебск, 9–11 октября 2013 г. / Вит. гос. ун-т; редкол.: А.Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – 322 с.
3. Актуальные проблемы источниковедения : материалы III Международной научно-практической конференции, Витебск, 8–9 октября 2015 г. / Вит. гос. ун-т; редкол.: А.Н. Дулов и М.Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2015. – 342 с.
4. Актуальные проблемы источниковедения : материалы IV Международной научно-практической конференции к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права, Витебск, 20–21 апреля 2017 г. / Витеб. гос. ун-т.; редкол.: А.Н. Дулов и М.Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2017. – 410 с.
5. Актуальные проблемы источниковедения : материалы V Международной научно-практической конференции к 110-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск, 25–27 апреля 2019 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А.Н. Дулов и М.Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2019. – 403 с.

***Щавлинский Н.Б.***

## ФАЛЬСИФИКАЦИЯ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ В ИНФОРМАЦИОННОМ ПРОСТРАНСТВЕ ЗАПАДНЫХ СТРАН

Информационную войну человечество научилось вести еще в глубокой древности. Методы ее ведения различны и многообразны. Например, в VI в. до нашей эры древнекитайский философ и военный деятель Сунь Цзы давал всевозможные рекомендации по проведению информационных войн. Он писал, что нужно разлагать все хорошее в стане противника, вовлекать его видных деятелей в преступные действия, подрывать престиж руководства противника, разжигать ссоры и столкновения среди граждан враждебной страны, подстрекать молодежь, ввести противника в обман кажущейся трусостью или слабостью [11, с. 7–350].

Одним из самых старых и эффективных методов является запугивание противника. Например, персидский царь Ксеркс I перед тем как вторгнуться в Грецию, через своих агентов распространял слухи о непобедимости своего войска: «…если все персидские воины выстрелят из луков, то стрелы затмят солнце» [9, с. 166] Чтобы добиться покорности населения захваченных территорий, против него нередко устраивали тотальный террор, граничащий с геноцидом. Так поступали Александр Македонский, Ганнибал, Чингисхан и многие другие. Например, когда войско Македонского вступило на территорию Индии, царь, чтобы устрашить укрывшихся



Репозиторий ВГУ